*М. П. Чайко, аспірант*
*Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.*
*Навуковы кіраўнік – С. А. Петэрсон,*
*кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт*

# ПРАБЛЕМА ПЕРСАНІФІКАЦЫІ МАСТАЦКІХ ВОБРАЗАЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў СУЧАСНАЙ МАНУМЕНТАЛЬНАЙ СКУЛЬПТУРЫ БЕЛАРУСІ

Устанаўленне помнікаў нацыянальным асветнікам, гумманістам – тэндэнцыя ў беларускай манументальнай скульптуры дастаткова “маладая”, свой пачатак яна бярэ з 80-х гадоў XX ст., нацыянальная тэматыка “вырасла” і сфарміравалася ў манументальных творах дзякуючы станковаму мастацтву. “…гісторыка-культурная спадчына пераасэнсоўваецца, акцэнты зрушваюцца на падзеі і персаналіі, якія садзейнічаюць фарміраванню нацыянаьнай самасвядомасці, этнічнай ідэнтыфікацыі…” [4, с. 92].

На мяжы XX–XXI стагоддзяў у Беларусі ўстаноўлены помнікі Кірылу Тураўскаму ў Тураве (1993, скульптар М. Іньскоў, архітэктар М. Лук’янчык), Гомелі (2004, скульптары Л. і С. Гумілеўскія, архітэктар М. Жлабо), Мінску (2001, скульптар А. Прохараў), Сімяону Полацкаму (Полацк, 2003, скульптар А. Фінскі, архітэктар Г. Федараў). З’явіўся шэраг твораў, што ўвекавечваюць вобраз беларусскага першадрукара Францішка Скарыны (Мінск, 2006, скульптар А. Дранец, архітэктары М. Вінаградаў, В. Крамарэнка), у Лідзе скульптара В. Янушкевіча, і, устаноўленыя за мяжой – ў Празе (1996, скульптар Э. Астаф’еў, архітэктар Ю. Казакоў), і ў Калінінградзе (2005, скульптар А. Арцімовіч). Ганаровае мейсца на цэнтральнай плошчы Мсціслаўля заняла скульптура Петра Цімафеевіча Мсціслаўца (2001, скульптары А. Батвіненак, А. Чыгрын, архітэктар Ю. Казакоў). Адбываецца пошук мастацкага увасаблення ў манументальнай скульптуры вобраза Еўфрасінні Полацкай (Мінск, 2002, скульптар А. Арцімовіч).

Вышэйпералічаныя творы сучаснага манументальнага мастацтва дэманструюць узнікненне новага тыпу помніка, увабраўшага ў сваю тэматычную структуру гісторыка-нацыянальнае гучанне. Разам з выкарыстаннем жанравых элемен-

таў, дакументальна-жыццёвай трактоўкі вобразаў, лепшым скульптурным творам уласціва сімвалічнае гучанне, набліжэнне пластычнай формы да знакавасці, архітэктанічнай цэльнасці. Мастакі імкнуцца найбольш выразна падкрэсліць значнасць дзейнасці асветніка, гуманіста ці рэлігійнага дзеяча ўводзячы ў кампазіцыйную структуру выяўленчыя элементы, што асацыіруюцца з духоўнай спадчынай герояў. Аднак, у выяўленчым мастацтве, у тым ліку і ў манументальнай скульптуры існуе стэрэатыпнае ўяўленне аб выяве гістарычных асоб: Ф. Скарына з кнігай, Е. Полацкая з крыжом і г.д., што ў сваю чаргу робіць гэтыя творы пазнавальнымі. Адыход ад стэрэатыпнага мыслення дастаткова павольны, іншая інтэрпрэтацыя вобраза, яго новае прачытанне абмяжоўваецца пошукам пластычных і стылістычных адценняў, характэрных індывідуальнаму аўтарскаму бачанню.

На сённяшні дзень, можна сцвярджаць аб фарміраванні ідэйна-вобразнай структуры гісторыка-нацыянальных помнікаў і неабходнасці раскрыцця гэтай тэмы ў наступных перыядах на больш якасным узроўні. Нягледзячы на кампазіцыйную і пластычную разнастайнасць, большасці твораў уласціва дакументальна-жыццёвая трактоўка, насычанасць жанравымі атрыбутамі, што, у сваю чаргу, робіць іх лёгкімі да ўспрымання, пазнавальнымі, аднак некаторая прамалінейнасць, хрэстэматыйнасць у трактоўцы герояў значна зніжае глыбіню ідэйна-вобразнага ўздзеяння скульптуры, манументы носяць, хутчэй, гуманітарныя ніж мастацкія якасці. Аднак, нельга адмаўляць наяўнасць пазітыўных, наватарскіх рыс, якія прагледжваюцца ў мастацкай сістэме твораў, і, перш за ўсё, гэта імкненне скульптараў да стварэння вобраза-сімвала, манументальнага помніка, дзе яднаюцца духоўная насычанасць і псіхалагічная, эмацыянальная выразнасць герояў, носьбітаў нацыянальнай культуры.

Мастацкая інтэрпрэтацыя вобраза асветніка, канцэптуальны падыход ў распрацоўцы гістарычнай тэмы разам з імкненнем стварыць сімвалічны па свайму гучанню помнік - аснова лепшых манументальных твораў гэтай тэмы.

Пластычнае ўвасабленне вобразаў Святых у манументальнай скульптуры з’ява новая, устаноўленыя за апошнія гады помнікі рэлігійным дзеячам Соф’і Слуцкай Радзівіл (Слуцк, 2000, скульптар М. Інькоў), Е. Полацкай (Полацк, 2000, скульп-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тар І. Голубеў), Афанасію Брэсцкаму (2005, Брэст, скульптары В. Гуршчанкова, П. Герасіменя, архітэктар А. Андраюк) адлюстроўваюць творчыя пошукі беларускіх скульптараў, аднак у большасці выкарыстоўваюцца мастацкія прыемы кананічнага жывапісу: статуарна-пласкасная трактоўка постаці, застылы, пазбаўлены псіхалагічна-эмацыянальнай афарбоўкі, аскетычны твар Святога, рэлігійны антураж, падкрэслена дэкаратыўнае вырашэнне вопраткі. Аднак такі падыход у выяўленні славутых рэлігійных дзеячоў значна зніжае вобразнае гучанне твора, пластычная скаванасць, кананічная ўмоўнасць, збядняюць ідэйны змест. Творы фармальна-схематычныя, банальныя па кампазіцыі і архітэктоніцы, максімальна даступныя для непадрыхтаванага гледача. Іх недахопы – адсутнасць прасторы для стварэння гледачом іншага, блізкага яму вобразнага шэрагу, немагчымасць узбагачэння сэнсавай часткі выявы. У выніку адбываецца прафанацыя дэкларуемай ідэі, яе поўнае непрыманне гледачом.

Трэба адзначыць, што помнікі тым, хто ствараў духоўныя каштоўнасці, пачынаюць дамінаваць у сучаснай прасторы, усе часцей яны займаюць свае мейсца на вуліцах і ў скверах беларускіх гарадоў. Менавіта ў гэтых творах, помніках знакамітых асветнікаў і гуманістаў, найбольш адчувальна праяўляюцца пошукі новых вобразных рашэнняў і нестандартных кампазіцый. Безумоўна, перад скульптарамі стаіць няпростая мэта – стварыць пазнавальны і, разам з тым, абагульняючы сімвал той ці іншай культурнай прасторы. Персаніфікацыя гістарычнай асобы непарыўна звязана з прывычным, распаўсюджаным ў грамадстве, стэрэатыпным уяўленні аб героі, што ў сваю чаргу дыктуе аўтару некаторыя мастацкія вырашэнні ў знешнім вобліку выявы.

Вобразы-сімвалы асветнікаў, увасобленыя ў манументальнай скульптуры, своеасаблівыя насіцелі духоўнай самасвядомасці этнаса, у іх закладзены актуальныя ва ўсе часы прадстаўленні аб сацыяльных і нраўственных каштоўнасцях. У гэтым сэнсе манументальны твор з’яўляецца культурнай і духоўнай памяццю народа, нацыі, дзяржавы.

---

*1. Войницкий, П.* Скульптура в городе. Белорусский опыт последних лет / П. Войницкий // Архитектура и строительство. – 2002. – № 5. – С. 3–6.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Вайніцкі, П.* За месяц і навякі. Беларуская манументальная скульптура апошняга дзесяцігоддзя / П. Вайніцкі // Мастацтва. – 2004. – № 10. – С. 26–30.

3. *Мятліцкая, І.* Пластычны вобраз эпохі / І. Мятліцкая // Мастацтва. – 2005. – №10. – С. 18–19.

4. *Сучасная* беларуская скульптура: альбом-каталог твораў рэспубліканскай выставы – Беларуская скульптура 1984–2004 годоў / уступ. арт. Л. Лапцэвіч, І. Мятліцкая, Н. Шаранговіч. – Мінск: Культура і мастацтва, 2007. – С. 187.

*Чжан Лу, аспирант*
*БГУ культуры и искусств.*
*Научный руководитель – Т. Н. Бабич,*
*кандидат искусствоведения, доцент*

# КОНКУРСЫ ВОКАЛЬНОГО ИСКУССТВА КИТАЯ. НОВЫЕ КОММУНИКАТИВНЫЕ КОНТЕКСТЫ СОВРЕМЕННОГО ИСКУССТВА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В современном обществе возрастает роль художественно-культурной деятельности в вовлечении человека в социум, в социализации и социальной адаптации личности, в укреплении общественных связей между людьми, решении проблем их совместного существования. Одной из эффективных технологий, которая помогает решать художественно-эстетические, социально-педагогические задачи, реализует личностно-развивающую, социально-организующую, креативную функции культуры, способствуя профессионализации творческой личности, является концертная деятельность. Она ярко иллюстрирует процессы развития китайской культуры на рубеже XX–XXI веков.

Как форма исполнительской деятельности, музыкальный конкурс отличается от других видов культурных мероприятий (праздник, фестиваль, показ, шоу, смотр и др.) наличием общехудожественных, профессиональных и научных целей и задач, масштабностью, разнообразием программы, широтой состава участников и др.

Музыкальная концертная деятельность в Китае на рубеже XX–XXI веков начала формироваться на региональном, национальном и международном уровнях, в среде профессио-